# Комплексная брыгада Канстанціна Букі выканала месячны план на 160 працэнтаў

☆ ☆

*Работнікі навукі і вышэйшай школы! Змагайцеся за росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс! Цясней сувязь з жыццём народа! Рыхтуйце спецыялістаў, дастойных эпохі камунізма!*

**(З Заклікаў ЦК КПСС да 42 гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).**


*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

**Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна**

№ 34 (379) | Субота, 31 кастрычніка, 1959 года. | Цана 10 кап.


**ЧЫТАЙ СЁННЯ:**


- З першым месцам — 1 стр.
- Добры дзень, «Журналіст» —1 стр.
- «Партызанскія сцежкі» —1 стр.
- У парткоме БДУ — 1 стр.
- Поспех нашых турыстаў —2 стр.
- «Паходжанне свядомасці» —2 стр.
- Слова біёлагаў цвёрдае —2 стр.




## З ПЕРШЫМ МЕСЦАМ!

...Іх трыццаць адзін чалавек. Трыццаць адзін зусім розных людзей: і маладых, як Тадэуш Бушмак, што яшчэ не паспелі змяніць форму навучэнцаў рамесных вучылішч; і пажылых вопытных будаўнікоў, як Аляксей Сямашка, які нават працу «па-сямейнаму»—укладвае цагліны, што падае яму жонка. І прафесіі ва ўсіх трыццаці аднаго розныя: муляры, мантажнікі, цесляры. Але не, не зусім розныя. Бадай, што кожны з членаў комплекснай брыгады Канстанціна Букі валодае хоць бы адной сумежнай прафесіяй і можа ў выпадку неабходнасці замяніць таварыша.



Аднак было б памылкай шукаць сакрэту поспехаў брыгады толькі ў высокай кваліфікацыі яе членаў. Галоўнае—дружба, гарэнне на рабоце, узаемадапамога. Трыццаць адзін чалавек у брыгадзе, і ўсе яны жывуць і працуюць, як адна вялікая і дружная сям'я.

І ў гэтым вялікая заслуга брыгадзіра Канстанціна Букі, вясёлага, жвавага чалавека, які, здаецца, рашыў даказаць, што прозвішча далёка не заўсёды адпавядае характару яго носьбіта. Ён то бярэ ў рукі кельму, то дапамагае падсобніцам перанесці кантэйнер з растворам, то ідзе да мантажнікаў. Раўняючыся на брыгадзіра, і астатнія члены брыгады працуюць з нязгасным запалам. На 140 працэнтаў выконвала брыгада норму. І гэта ўжо стала для яе законам. Уступаючы ж у сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар Вялікага Кастрычніка, дружны калектыў узяў на сябе павышаныя абавязацельствы—выканаць 600 кубічных метраў цагельнай кладкі, зманціраваць 360 кубічных метраў зборнага жалезабетону і 16 кубічных метраў лесвічных клетак.

Нібы зладжаны ансамбль працуе ў гэтыя дні брыгада. 160 працэнтаў нормы штодзённа дае яна! Комплексная брыгада Канстанціна Букі выйшла не толькі на першае месца сярод брыгад першага ўчастка УНР-7, занятых на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта, яна заваявала права называцца лепшай брыгадай будаўнічага трэста № 2.

З першым месцам вас, таварышы!

**А. ГАРЭЗНЫ.**

На здымках: 1. Мантажнікі за работай. 2. Брыгадзір Канстанцін Бука.

## ДОБРЫ ДЗЕНЬ, „ЖУРНАЛІСТ“!

БАДАЙ ШТО, цэлы тыдзень па ўсіх цэхах Мінскага завода аўтаматычных ліній хадзілі дапытлівыя юнакі і дзяўчаты, заглядалі амаль у кожны куток.

Па нязменных журналісцкіх атрыбутах—блакнотах і аўтаручках—дагадваліся рабочыя, што маюць яны нейкія адносіны да гэтага слаўнага, неўтаймавальнага племя. І дзівіліся крыху, чаго гэта раптам маладое прадпрыемства стала аб'ектам пільнай увагі цэлага атрада журналістаў...

І вось перад намі першы нумар вучэбнай газеты «Журналіст». Нумар рыхтавала на заводзе аўтаматычных ліній група студэнтаў 5-га курса пад кіраўніцтвам дацэнта М. С. Зярніцкага. Яго выхад у свет—вялікая і радасная падзея для ўсяго аддзялення журналістыкі.

Раней адным з найбольш сур'ёзных недахопаў у сістэме падрыхтоўкі журналістаў у нашым універсітэце было тое, што навучанне слаба звязвалася з практыкай газетнай работы. Вучэбныя заданні па праграме тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку да апошняга часу часцей за ўсё таксама не былі звязаны з жыццём, і далей, чым у партфель выкладчыка, не ішлі. Натуральна, што такія заданні не былі папулярнымі сярод студэнтаў.

Цяпер узнікае магчымасць змяніць такое становішча.

У першым нумары нямала творчых поспехаў. Ён удала звярстаны, умела падабраны шрыфты матэрыялаў. Працоўныя будні рабочых завода, усё перадавое, новае ў арганізацыі вытворчасці, перспектывы развіцця прадпрыемства ў сямігодцы, быт і адпачынак стваральнікаў аўтаматычных ліній і складанейшых станкоў, спорт, а таксама ўсё тое, што перашкаджае нашаму руху ўперад, знайшлі адлюстраванне на старонках газеты. І, што важна адзначыць, пазіцыя аўтараў заметак зусім не сузіральная. Яны горача прапагандуюць лепшае, гнеўна абрушваюцца на недахопы. Па развароту «З натхненнем працуе калектыў завода, выконваючы заданні сямігодкі» чытач яскрава адчувае пульс жыцця прадпрыемства. Тут і расказ аб пачыне «1+1», і заклік перайсці на самаабслугоўванне па прыкладу рабочых участка шпіндзельных карабкоў зборачнага цэха, і размова аб трэцяй запаведзі брыгад, што змагаюцца за званне брыгад камуністычнай працы, запаведзі «жыць па-камуністычнаму». Востра напісана выступленне мадэльшчыка В. Мыслюўца «Гэта нам перашкаджае». Прыцягвае ўвагу чытача матэрыял А. Акуліка і Ю. Нікалаева «Якасць робяць людзі».

Наогул, у першым нумары «Журналіста», паўтараем, нямала ўдач. І ўсё ж ёсць у яго і некаторыя хібы. Хацелася б, каб некаторыя матэрыялы былі напісаны больш сакавітай, вобразнай мовай, каб іх загалоўкі былі больш жывымі, яркімі. Патрабуе асобнай падтэкстоўкі апошні здымак на чацвёртай старонцы. Ёсць стылістычныя і граматычныя памылкі («шэфства высокаразраднікаў над нізкаразраднікамі», «нежаданыя недахопы» замест «непажаданыя», «выбухованебяспечных электрарухавікоў» і некаторыя іншыя). І ўсё ж гэтыя недахопы не зніжаюць вартасці першага нумара нашай вучэбнай газеты, якая павінна стаць творчай лабараторыяй журналісцкага майстэрства.

## У парткоме БДУ

Днямі адбылося пасяджэнне парткома універсітэта, на якім абмяркоўвалася пытанне аб стане самаабслугоўвання ў студэнцкім інтэрнаце № 1, што па вуліцы Свярдлова. З дакладамі выступілі старшыня студкома Я. Шарамецьеў і намеснік сакратара парткома В. І. Старавойтаў. Абмяркаванне дакладаў паказала, што самаабслугоўванне патрабуе яшчэ большай увагі з боку грамадскіх арганізацый і адміністрацыі універсітэта. Палепшыўся санітарны стан інтэрната. З увядзеннем самаабслугоўвання студэнты атрымліваюць навыкі самастойнай працы. Яно ж дае значную эканомію грашовых сродкаў.

Партком указаў на шэраг сур'ёзных недахопаў у справе культурна-масавай і палітыка-выхаваўчай работы ў студэнцкіх інтэрнатах.

**М. ВАСІН,**
**старшыня прафкома.**

Прачытайце гэту кнігу

## „ПАРТЫЗАНСКІЯ СЦЕЖКІ“

*Аб гераізме народных мсціўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, аб мужнасці простых савецкіх людзей расказваецца ў зборніку нарысаў дацэнта універсітэта Язэпа Зазекі «Партызанскія сцежкі», выдадзеным у гэтым годзе Дзяржаўным выдавецтвам БССР.*

*Аўтар—удзельнік усенароднай барацьбы з гітлераўцамі—прысвяціў гэты зборнік камсамольцам Беластоцкага партызанскага злучэння.*

*З кніжкі чытач даведаецца пра тых, хто цаной свайго жыцця здабываў свабоду Радзіме («Цана жыцця»); пра смелых разведчыкаў, што прабіраліся нават у эсэсаўскія часці («Жоўтая кніжка»); пра школьнікаў, якія змагаліся разам са старэйшымі, праводзячы партызанскія групы па толькі ім адным вядомых сцежках і кладках. («Юркава сцежка»). Цэлымі сем'ямі ішлі помсціць савецкія людзі ворагу за родныя вогнішчы, за загінуўшых і за тых, хто пакутаваў у фашысцкай няволі («Сям'я мсціўцаў», «Помста»).*

*Апошні нарыс («Цімохава шчасце») расказвае аб адраджэнні вёскі пасля вайны, пра былога партызана, якога калгаснікі выбіраюць брыгадзірам.*

*(«Літаратура і мастацтва»)*

# ПОСПЕХ НАШЫХ ТУРЫСТАЎ



*Дваццаць тры члены універсітэцкай секцыі турызма-альпінізма адправіліся ў суботу, 17 кастрычніка, на рэспубліканскі злет турыстаў. На бераг Мінскага мора паблізу станцыі Крыжоўка прыбылі прадстаўнікі пятнаццаці калектываў з разных гарадоў БССР. Вечарам ля кастра вопытнейшыя беларускія альпіністы расказалі моладзі аб сваіх апошніх паходах. Турысты хутка знаёмяцца і знаходзяць агульную мову—чуюцца жарты, смех, вясёлыя і задушэўныя песні. Шкада, што заседжвацца доўга не прыйшлося—у 7 гадзін раніцы пачаліся спаборніцтвы.*

*Першы від турысцкага двухбор... двaяборства — праходжанне закрытага маршруту. Кожная каманда атрымала пісьмовае прадпісанне аб напрамку і працягласці першага этапа. У канцы гэтага этапа турысты павінны былі знайсці замаскіраваную палатку і атрымаць далейшыя ўказанні. Увесь маршрут складаўся з пяці этапаў, даўжынёй каля двух кіламетраў кожны. Наша каманда прайшла ўвесь маршрут за 2 гадзіны 23 мінуты, затраціўшы амаль гадзіну ў пошуках першай з кантрольных палатак. Вынік не вельмі дрэнны, калі ўлічыць, што каманда АН БССР («акадэмікі»!) шукала гэтую палатку 5 гадзін і вярнулася ні з чым. Не прайшлі маршрут яшчэ дзве каманды.*



*З 12 гадзін пачалася другая палавіна спаборніцтваў—турысцкая эстафета. Яна складалася з васьмі этапаў: бег на 300 метраў, бег на 800 метраў, веласіпедная гонка на 3 кіламетры, грэбля на 800 метраў, бег на 100 метраў, пераправа па канату, устаноўка палаткі, распальванне кастра і кіпячэнне 3 літраў вады. На ўсё гэта наша каманда затраціла 19 мінут 10,6 секунды. Наш час быў трэцім: уперадзе ўсяго на адну мінуту аказалася каманда Гомеля, у якую ўваходзілі не турысты, а чэмпіён СССР па грэблі, першаразраднік па веласпорту і г. д. Першая каманда Мінскага медінстытута была другой з часам 19 мінут.*

*Эстафета таксама не абыйшлася без кур'ёзаў. Веласіпедысты павінны былі праехаць трохкіламятровы круг па лясных сцяжынках і вярнуцца да зыходнага месца. Выйшлі са старту веласіпедысты Гродна і ДСТ «Чырвоны сцяг». Іх чакаюць 5 мінут, 10 мінут, 15 мінут..., нарэшце, у адзін і той жа час яны паявіліся... з розных бакоў дарожкі і разам закончылі этап!*

*Калі былі падведзены вынікі спаборніцтваў, аказалася, што каманда універсітэта, выступаўшая як зборная ДСТ «Буравеснік», заняла другое месца ў першынстве БССР па турысцкаму двухборству, уступіўшы першынство Мінскаму медыцынскаму інстытуту—старэйшаму турысцкаму калектыву рэспублікі.*

*У нас ёсць усе магчымасці ў будучых спаборніцтвах заняць першае месца, калі ў секцыю турызма прыдзе новае добрае папаўненне. Іх чакаюць цікавыя справы: у планах секцыі зімовыя і летнія паходы па Беларусі, па Карэліі, па Каўказу, па Алтаю і іншых раёнах нашай неабсяжнай Радзімы.*

*На здымках: 1) Вось так перапраўляюцца і праз горныя рэкі. В. Радашкевіч (геафак) на адным з этапаў турысцкай эстафеты.*

*2) Суддзя спаборніцтваў, вядомы альпініст Г. Пржэляскоўскі аб'яўляе вынік спаборніцтваў.*

*А. ФЕДЗЕНКА.*
*М. НЕМЕНМАН.*

# СЛОВА БІЁЛАГАЎ ЦВЁРДАЕ

**—Не будзем на апошнім месцы па спорту!—так сказалі студэнты-біёлагі.**

**Гэтыя словы не засталіся проста на паперы. Яны штодзённа ператвараюцца ў жыццё факультэта. У верасні можна было пабываць на агульнауніверсітэцкіх спаборніцтвах першых курсаў па валейболу і баскетболу. Сваёй гульней біёлагі паказалі, што яны больш не прэтэндэнты на апошняе месца. Асабліва яркай старонкай барацьбы за высокае месца з'явіўся першы этап круглагадавой спартакіяды, які закончыўся 12 кастрычніка. Нягледзячы на дрэннае надвор'е, у спаборніцтвах прынялі ўдзел 220 чалавек з 256. Разам са студэнтамі стартавалі і выкладчыкі.**

**НА ЗДЫМКУ:** Старт забегу на 100 м.



# „Паходжанне свядомасці"

Пад такой назвай нядаўна ў выдавецтве універсітэта вышла манаграфія П. Ф. Пратасені. Гэтая кніга ўнясе, несумненна, уклад у вырашэнне аднаго з асноўных пытанняў філасофіі—пытання аб паходжанні і сутнасці свядомасці.

Ва ўводзінах аўтар спыняецца на тэарэтычных прынцыпах, прадмеце даследавання, характарызуе метад і крыніцы для вывучэння гэтай вельмі важнай навуковай праблемы. Аўтар паказвае негрунтоўнасць ідэалістычных поглядаў на паходжанне і сутнасць свядомасці.

П. Ф. Пратасеня даказвае, што адзінай умовай даследавання пытання аб паходжанні і сутнасці свядомасці могуць быць прынцыпы дыялектычнага матэрыялізма, кіруючыся якімі, навука у стане вырашыць гэту праблему.

У першым раздзеле гаворыцца аб умовах паходжання свядомасці. Біялагічныя, а затым сацыяльныя фактары садзейнічалі прагрэсу чалавека на ўсім шляху з жывёльнага свету. Як падкрэслівае аўтар, сфера дзеяння сацыяльных заканамернасцяў, якія рабілі ўплыў на развіццё продка чалавека, расшыралася за кошт звужвання біялагічных фактараў. Важнейшымі біялагічнымі фактарамі лічыліся прамахаджэнне, арыентыровачны рэфлекс і стадны інстынкт. Аўтар падрабязна спыняецца на значэнні кожнага з іх у паасобку, адначасна крытыкуючы няправільныя сцвярджэнні некаторых вучоных па гэтым пытанні. Затым П. Ф. Пратасеня спыняецца на абчалавечваючым значэнні прыродных фактараў, падкрэслівае велізарны ўплыў на станаўленне чалавека змяненне характару харчавання ў яго папярэдніка-гамініда. Мясная ежа з'явілася важнай прадпасылкай у станаўленні мозгу.

Аўтар заўважае, што было б аднак грубай памылкай выводзіць з якасці ежы ўвесь духоўны свет людзей, паколькі свядомасць чалавека залежыць у першую чаргу ад сукупнасці ўмоў грамадскага, а не фізіялагічнага характару. К. Маркс адзначаў, што свядомасць—гэта грамадскі прадукт і застанецца ім, пакуль наогул будуць існаваць людзі. Асноўнае, што вывела чалавека з асяроддзя жывёл,—была праца, сацыяльныя сілы. Аб гэтым піша аўтар грунтоўна і ў поўнай згодзе з вучэннем класікаў марксізма-ленінізма і данымі навукі.

П. Ф. Пратасеня спыняецца на значэнні вырабу прылад працы, паказвае, што гэты працэс з'яўляецца найбольш характэрным для чалавека, адрозніваючым яго ад царства жывёл. З моманту пачатку вырабу прылад працы чалавекам па сутнасці і пачынаецца гісторыя чалавецтва. У працэсе працы, якая садзейнічае развіццю мыслення, у чалавека нараджаецца мова. Доказы аўтара будуюцца на падставе вядомага меркавання Ф. Энгельса аб тым, што «спачатку праца, а затым і разам з ім членападзельная мова з'явіліся двума самымі галоўнымі стымуламі, пад уплывам якіх мозг малпы паступова ператварыўся ў чалавечы мозг».

Як падкрэслівае П. Ф. Пратасеня, з паяўленнем мовы завяршаюцца ўмовы, без якіх не магла нарадзіцца свядомасць, якая не столькі прадукт прыроды, колькі вынік працоўнай актыўнасці грамадскага чалавека.

У другім раздзеле аўтар падрабязна спыняецца на ролі працоўнай дзейнасці людзей у фарміраванні іх свядомасці. П. Ф. Пратасеня цікава ставіць пытанне аб сутнасці вырашэння праблемы, гаворачы, што растлумачыць паходжанне свядомасці—гэта значыць, растлумачыць перш за ўсё паходжанне ўсвядомленай чалавечай дзейнасці па вытворчасці прылад працы. Тут важная думка аб тым, што розум не мог нарадзіцца без працы, а сама чалавечая праца немагчыма без кіраўніцтва розуму.

Цікава выкладае аўтар пытанне аб мове, яе надзвычайнай важнасці ў жыцці людзей. Матэрыял падаецца ў плане адзінства такіх з'яў, як зносіны, праца, мысленне, мова.

У наступным раздзеле даецца характарыстыка мозгу, яго эвалюцыі. П. Ф. Пратасеня на багатым фактычным матэрыяле пацвярджае матэрыялістычнае меркаванне аб тым, што мысленне ёсць функцыя вышэйшай арганізаванасці матэрыі мозгу.

Безумоўную цікавасць мае параграф другі «Спадчыннасць і псіхіка» ў трэцім раздзеле манаграфіі. Прыведзеныя тут матэрыялы надзвычай каштоўныя ў барацьбе з усялякімі вейсманісцка-моргана ўскімі антынавуковымі ідэалістычнымі канцэпцыямі, а таксама чалавеканенавісніцкімі расісцкімі выдумкамі. Аўтар паказвае, што прагрэсіўнае разумовае развіццё чалавецтва адбываецца не дзякуючы біялагічнай паслядоўнасці псіхічных працэсаў уяўлення і вопыту, набытага асобнымі людзьмі, а дзякуючы пераймальнасці матэрыяльнай культуры і мовы, якія захоўваюць вынікі чалавечай працы і ведаў і нясуць іх будучым пакаленням паміма фізіялагічнага механізма спадчыннасці.

Пяты раздзел прысвечаны абгрунтаванню спецыфічных асаблівасцей чалавечай свядомасці. Гэтымі асаблівасцямі аўтар лічыць у першую чаргу мэтанакіраваную творчасць, яе суб'ектыўнае усведамленне і слоўнае мысленне. У паводзінах жывёл і нават у праяўленні іх псіхікі (канкрэтным мысленні) нельга выявіць свядомасці. Жывёлы не ведаюць мэты, не прадбачаць выніку, не могуць улавіць сувязь паміж прычынай і вынікам. Жывёлы могуць мець вобраз канкрэтнага прадмета, але плана дзеянняў яны пазбаўлены. У рабоце П. Ф. Пратасені асветлены і многія іншыя пытанні, якія немагчыма пералічыць у невялікім артыкуле.

На наш погляд, у кнізе ёсць некаторыя недахопы. Першы раздзел часткова носіць характар уводзін, паколькі многія пытанні, якія называюцца тут, у наступных раздзелах атрымліваюць самастойнае і поўнае абгрунтаванне, а таму назіраецца некаторае паўтарэнне. Аўтар спрабуе размежаваць паняцці свядомасць і мысленне. На старонцы 129 ён піша, што мысленне—вышэйшая форма свядомасці, яна неад'емны яго элемент. Аўтар часта сам называе адны і тыя ж з'явы то свядомасцю, то мысленнем, тым самым пярэчачы сабе. На старонцы 90 даецца непераканаўчы доказ таго, чаму рот стаў асноўным органам мовы. Сустракаюцца і стылістычныя пагрэшнасці. На 29 старонцы, толькі ў адным абзацы чатыры разы выкарыстана слова «фарміраваць».

Аднак адзначаныя і некаторыя іншыя пагрэшнасці не змяншаюць таго вялікага навуковага значэння, якое мае самастойная і добра аргументаваная работа П. Ф. Пратасені. Кніга спалучае папулярнасць выкладання з глыбокай навуковасцю, прасякнута страсным публіцыстычным духам і носіць ярка выражаны атэістычны характар.

**А. САМАЛЬ.**

Рэдактар **М. ЦІКОЦКІ.**


## АБ'ЯВА

**Прафесары, выкладчыкі і аспіранты вышэйшых навучальных устаноў! Чытайце штомесячна часопіс «ВЕСТНИК ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ»—орган Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыіі СССР.**

**У часопісе асвятляюцца актуальныя праблемы вышэйшай адукацыі, расказваецца аб вопыце вышэйшых навучальных устаноў па перабудове вучэбна-выхаваўчай работы, на аснове злучэння навучання з вытворчай працай.**

**Чытач знойдзе тут артыкулы аб падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў, па гісторыі айчыннай педагагічнай думкі, даведаецца аб новай вучэбнай літаратуры, пазнаёміцца з зарубежнай вышэйшай школай.**

**У «Вестнике высшей школы» супрацоўнічаюць вядомыя вучоныя, дзеячы вышэйшай школы, работнікі грамадскіх арганізацый.**

**На часопіс «Вестник высшей школы» можна падпісацца ў любым паштовым аддзяленні або ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку. Падпісная цана—60 рублёў на год, 30 рублёў на паўгода.**

**НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА НА ЧАСОПІС «ВЕСТНИК ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ»!**


**Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19.**

АТ 10977. Зак. 1648. **Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна.** Тыраж 2000 экз.